**Дар’я Фурман**

# Новая старая казка

Бяру ў рукі кнігу З. Бядулі “Сярэбраная табакерка”, ведаю, што гэта казка, але маю ўвагу прыцягнула аповесць таму, што гэта апошні твор вядомага пісьменніка, напісаны ў 1940 годзе. У час Вялікай Айчыннай вайны дом Змітрака Бядулі згарэў, згарэлі ўсе яго рукапісы, і толькі нейкі цуд – інакш не скажаш – выратаваў ад гібелі “Сярэбраную табакерку”. Для мяне гэта стала рашаючым пры выбары твора.

Казку пра сярэбраную табакерку апавядае дзед сваім унукам. Дзед-казачнік мае прозвішча Заяц, і апавядае ён пра свайго далёкага родзіча, таксама Зайца. Ён з’яўляецца пра-пра-пра-прадзедам малых слухачоў. Каб было зручна, яго называюць “Дзіда-дзед”.

Звычайна ў казках заяц – гэта палахлівая жывёліна, але толькі не ў гэтым творы. Тут ён ваюе са сваімі нядобразычліўцамі, нават больш таго – Заяц злавіў і запаланіў у сярэбранай табакерцы Смерць, чым ашчаслівіў усё жывое на зямлі. Толькі чорныя рыцары Смерці, усе тыя, што карысталіся яе паслугамі, каб трымаць народ у паслушэнстве, незадаволены і хочуць вызваліць яе. Сцерагчы Смерць Зайцу і яго сябрам нялёгка, бо ёсць карыслівыя людзі, якія жадаюць славы, багацця для сябе, а не думаюць аб інтарэсах усіх. Дэспатызм, культ сваёй асобы, эгаізм, прага нажывы мяшае некаторым атрымаць асалоду ад неўміручасці. Многія кіруюцца правілам: “лепш… быць смяротнымі багачамі, чымся неўміручымі беднякамі ”.

Пытанні жыцця і смерці, дабра і зла з’яўляюцца спрадвечнымі, і З. Бядуля ў творы выказвае свой погляд на гэтыя пытанні.

Казка заканчваецца тым, што Заяц згубіў табакерку і Смерць выскачыла на волю. З таго часу вайна паміж працоўным народам і рыцарамі Смерці цягнецца па сённяшні дзень. Пісьменнік вуснамі дзеда Зайца звяртаецца да моладзі: “Калі вы, дарагія ўнукі, зловіце Смерць у няволю, дык моцна трымайце і ніколі з рук не выпускайце. А я ўпэўнены, што зловіце… Трэба толькі знішчыць раней прыслужнікаў Смерці, у якіх вочы завідушчыя і рукі заграбушчыя”.

Скончыўся твор, а роздум над яго сэнсам працягваецца. Мне здаецца, што зараз, у сучасны час, вельмі ўжо разышліся прыслужнікі смерці. Пачынаючы з 2019 года на Зямлю прыйшоў страшны вірус – вірус смерці, covid-19. Ужо ідзе трэці год, а ён нікуды не знікае, становіцца ўсё больш крыважэрны, усё больш забірае чалавечыя жыцці. Здаецца, што смерць рыхтуе страшны баль, радуецца болю, слязам, і лепшая для яе музыка – гэта людскі плач. Хочацца ўсё спыніць… Я працягну казку.

Сучасныя сямікласнікі, цудоўныя сябры, Рыгор, Міша і Надзейка пазнаёміліся з аповесцю-казкай З.Бядулі “Сярэбраная табакерка”. З аднаго боку, гэта былі дзеці-летуценнікі, якія любілі марыць, падарожнічаць у сваіх думках, а з другога боку, яны жылі ў сваім віртуальным свеце, адыходзілі ад рэальнасці, насалоджваліся тым, што гэты свет належыў толькі ім. Але covid-19 унёс свае карэкціывы: дзеці перажывалі за здароўе родных і блізкіх людзей, сустрэчы сяброў сталі вельмі рэдкімі і небяспечнымі. Тады дзеці вырашылі паспрабаваць паўтарыць подзвіг Дзіда-дзеда, вызваліць свет ад жудаснага віруса, ад хвароб і смерці.

Задумка іх была простая: знайсці слабое месца ў смерці. І, здаецца, яны яго прыдумалі. Віртуальны свет вельмі падобны на рэальны, толькі там ніхто ніколі не памірае, людзі і жывёлы, розныя істоты могуць шмат разоў адраджацца, паўтараць адзін і той жа момант жыцця.

– Слухайце, – заўважыў Рыгорка, – а ў камп’ютарным свеце няма смерці, яна там не жыве. Усе жыхары насміхаюцца, не разумеюць, што такое – гэтая смерць.
– Так, – падтрымаў Міша. – Няўжо смерці ўсё роўна? Няўжо не хочацца паказаць сваю прысутнасць? Даказаць, што яна існуе.
– Ой, а як жа яна так апынецца? – засмуцілася Надзейка. – Яна ж не ведае, як туды трапіць.У яе хутчэй за ўсё і камп’ютара няма…

Размову сяброў падслухала смерць. Яна ўвогуле чула ўсё, дзе вымаўлялася яе імя. Крыўдна стала ёй, злосна: што гэта за месца, што яе ўлада там не распаўсюджваецца? Яна не магла страціць свой уплыў на ўсё жывое. Яе павінны баяцца ЎСЕ, і кропка. Смерць хутка даведалася, што гэта за віртуальны свет, зразумела, што словы дзяцей – гэта чыстая праўда. Патрэбна было выпраўляць становішча. Яна і выправіла…

Дзеці заўважылі, што героі ў камп’ютары не перараджаюцца, што ўсё змянілася. Кемлівасць вучняў дазволіла хутка закрыць гульню і сцерці яе зусім. Дзеці радаваліся, што першы этап іх задумы зроблены. Смерць у пастцы. Справа за другім: усе разам павінны запусціць праграму на ліквідацыю гэтай гульні з усіх камп’ютараў. Узяліся за работу.

– Гатова! – радасна ўскрыкнулі сябры.

Трэці этап быў самы складаны. Нельга было нікому гаварыць пра тое, што яны зрабілі. Менш людзей ведае – спакайней.

Змяненні ў свеце сталі відавочнымі ўжо на наступны дзень: навіны са станоўчай статыстыкай, ні адной смерці, ні адзін чалавек не захварэў… Сябры былі задаволены. А яшчэ больш грэла ім душу тое, што яны гэта зрабілі, усе разам. Сяброўства – вялікая сіла!

Маё апавяданне-казка скончана. Як жа хочацца, каб яно стала рэальнасцю! Няхай так і будзе! Кладуся спаць і ўяўляю…